УДК 821.161.3-84:37.013.43 DOI 10.63874/2218-029X-2025-3-29-33

*Ала Яўгенаўна Леванюк*
*канд. філал. навук, дац., заг. каф. методык дашкольнай і пачатковай адукацыі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Ala Levanyuk***
*Candidate of Philological Science, Associate Professor,*
*Head of the Department of Methods of Preschool and Primary Education*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: levonyuk.alla@mail.ru

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АФАРЫСТЫКА ЯК КРЫНІЦА НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ

*Нацыянальная педагогіка забяспечвае агульны духоўны прагрэс як асобы, канкрэтнага этнасу, так і чалавецтва ў цэлым. Адзначана, што ў розныя гістарычныя эпохі і пад уплывам разнастайных культурных, гістарычных і ўласна моўных фактараў узнікла цікавасць да ёмістага кароткага выражэння думкі – афарыстычнасці. Народная педагогіка таксама аперыруе шматлікімі народнымі афарызмамі – прыказкамі, якія дапамагаюць нам засвоіць і перадаць нашчадкам духоўныя скарбы народа. Абаснавана, што нацыянальная афарыстыка, да якой адносяцца і народныя, і літаратурныя афарызмы, з'яўляецца невычэрпнай крыніцай народнай педагогікі.*
***Ключавыя словы:*** *носьбіт нацыянальнай культуры, нацыянальная афарыстыка, народная педагогіка, выхаванне, патрыятызм.*

## *National Aphoristics as a Source Folk Pedagogy*

*National pedagogy ensures the overall spiritual progress of both the individual, a particular ethnic group, and humanity as a whole. It is noted that in different historical epochs and under the influence of various cultural, historical and linguistic factors, there was an interest in a succinct short expression of thought-aphorism. Folk pedagogy also uses numerous folk aphorisms-proverbs that help us assimilate and pass on to our descendants the spiritual treasures of the people. It is proved that national aphoristics, which includes both folk and literary aphorisms, is an inexhaustible source of folk pedagogy.*
***Key words:*** *the bearer of national culture, national aphoristics, folk pedagogy, education, patriotism.*

### Уводзіны

Сёння, як, дарэчы, і заўсёды, востра стаіць пытанне выхавання нашай моладзі. І тут, як здаецца, усе сродкі добрыя. Адным з такіх сродкаў з'яўляецца народная педагогіка, якую мы можам вызначыць як адзін са складнікаў педагагічнай культуры. Народная педагогіка забяспечвае агульны духоўны прагрэс як асобы, канкрэтнага этнасу, так і чалавецтва ў цэлым.

Такія вучоныя, як Г. М. Філонаў, А. Ш. Гашымаў, А. Э. Ізмайлаў, К. Д. Ушынскі і інш., вызначалі народную педагогіку як сукупнасць назапашаных і праверaных на практыцы эмпірычных ведаў, уменняў і навыкаў, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне як вынік гістарычнага і сацыяльнага вопыту народа, пераважна ў вуснай форме.

Трэба адзначыць несумненную значнасць традыцый народнага выхавання для сучаснай педагагічнай навукі. Па-першае, не патрабуе доказу тое, што народная педагогіка з'яўляецца падмуркам для развіцця педагагічнай навукі.

Па-другое, менавіта з узнікненнем адукацыйных устаноў, з развіццём навуковай педагогікі ўзбагачаецца педагагічны вопыт народаў. Як раз на аснове народнай педагогікі і педагагічнай навукі і склаўся нацыянальны ідэал носьбіта культуры.

### Нацыянальная афарыстыка як невычэрпная крыніца народнай педагогікі

У народнай педагогіцы выдзеліліся наступныя накірункі выхавання: працоўнае, маральнае, разумовае, эстэтычнае, рэлігійнае, фізічнае. У сукупнасці яны і складаюць ідэал сучаснага чалавека, створаны намаганнямі ўсіх народаў, а ўяўленні пра ідэал кожнага асобнага народа ўжо ўвасоблены ў нацыянальных ідэалах выхавання, у этнічных маральных каштоўнасцях, закадаваных у яго традыцыях і перадаваемых з пакалення ў пакаленне пры дапамозе абрадаў, звычаяў, твораў вуснай народнай творчасці і інш. [1, с. 15].

Мова ніколі не стаяла асобна ад выхавання. Менавіта дзякуючы слову перадаецца бясцэнны вопыт нашых продкаў, іх думкі, мары і ідэалы. У розныя гістарычныя эпохі і пад уплывам разнастайных культурных, гістарычных і ўласна моўных фактараў узнікла цікавасць да ёмістага краткага выражэння думкі, да яе афарыстычнасці. Народная педагогіка таксама аперыруе шматлікімі народнымі афарызмамі – прыказкамі, якія дапамагаюць нам засвоіць і перадаць нашчадкам духоўныя скарбы народа.

Народны вопыт, увасоблены ў гэтых сціслых шэдэўрах народнай творчасці, вельмі дакладна характарызуе рысы, звычкі і паводзіны беларуса: *Без гаспадара дом – сірата*; *Брахаць – не цэпам махаць*; *Бярэ не сіла, а смеласць*; *Век жыві – век вучыся*; *Гаспадар пачынае будавацца з гумна*; *Дзе госць, там і бог ёсць*; *Добрага многа не бывае*; *Ехаўшы бачком, ні з кім не зачэпішся*; *Матчына слова ў пялёнкі кладзе і за труною ідзе*; *Праўда грубая, ды людзям любая* і інш.

Сапраўды, нацыянальная афарыстыка, да якой мы адносім і народныя, і літаратурныя аффрызмы, з’яўляецца невычэрпнай крыніцай народнай педагогікі. У беларускай культуры ідэал носьбіта нацыянальнай культуры звязваецца перш за ўсё з працоўнай дзейнасцю, якая ў славян лічыцца галоўнай рысай духоўнасці чалавека. Менавіта дзякуючы працы ўзнікла прыкладное мастацтва, вусная народная творчасць, якія раскрывалі сутнасць працы, маральныя адносіны, па сутнасці, маральны кодэкс, які ўключаў любоў да працы, павагу да працаўніка, беражлівасць, акуратнасць. Узніклі рэлігія і міфалогія, якія дапамагаюць пераносіць цяжкасці працоўных дзён.

Праца для беларусаў – гэта першааснова жыцця. Мы з павагай адносімся да людзей працавітых і вельмі не любім гультаёў: *Самы лепшы лекар ад нуды – праца* (У. Шыцік); *Доўга чакаць вечара, калі ніякага занятку няма* (Л. Калюга); *Колькі навыдумлівалі ад бяссонніцы / Розных парашкоў, пілюль і кропляў, / Забыўшыся пра верны сродак – працу* (М. Танк); *Трэба было б уставіць у ранішнюю малітву словы: «Згінь навекі ўсё, што перашкаджае ў працы!»* (М. Танк); *Не кроч на сцежкі бакавыя – / Ямчэй сказаць, памені зрабіць, – / Бяры адказ сабе на шыю, / Не на сяброўскія гарбы* (М. Лужанін); *Без мазаля чалавека спрадвеку / Не лічаць у нас, не завуць чалавекам* (М. Рудкоўскі); *Непрацавітым – капейка цана* (Д. Бічэль-Загнетава) і інш.

Партрэт носьбіта беларускай нацыянальнай культуры быў бы няпоўны без такой характарыстыкі, як патрыятызм, які мы разумеем як пачуццё любові і адданасці Радзіме, Айчыне, свайму народу, веру ў яго духоўныя магчымасці, гатоўнасць служыць інтарэсам Радзімы.

Радзіма – гэта гонар за сваіх продкаў, якія будавалі гэтае жыццё для нас, для таго, каб мы жылі пад мірным небам, якое яны перадалі нам для зберагання. Сапраўдны патрыёт заўсёды будзе працягваць традыцыі сваіх продкаў.

Радзіма – гэта неад’емная частка нашага жыцця. Калі ты не прайшоў міма дзіцяці, якое плача, старога чалавека, якому патрэбна дапамога, свайго суседа, ганарышся сваёй сям’ёй і сваімі продкамі, любіш свой горад, імкнешся зрабіць яго чысцейшым і прыгажэйшым, шануеш сваю Айчыну, то ты сапраўдны патрыёт.

Вельмі слушна падкрэсліваюць гэтыя тэзісы і нацыянальныя літаратурныя афарызмы: *Патрыятызм – гэта ўпрыгожванне Радзімы талентамі і справамі* (Г. Марчук); *Пытаешся, дзе радзіма? Дзе пахавана твая маці, там і радзіма* (Г. Марчук); *Каб зрабіць першы крок, / Патрэбна нам / Рука маці; / Каб, спатыкнуўшыся, / Зноўку падняцца – / Вера ў дарогу; / Каб адчуць цяпло сонца – / Дружба; / Каб не знаць адзіноцтва – Радзіма* (М. Танк); *Усё ж пазнаеш і па ўдарах сэрца, / Дзе наша, дзе чужая старана* (М. Танк); *Няма радней, чым родны кут* (П. Броўка); *Усе шляхі прыводзяць не да Рыма, / А да родных вербаў і бяроз* (У. Караткевіч); *Без радзімы народа няма, / Без народа няма радзімы* (Р. Барадулін); *Чым бліжэй родныя мясціны, тым болей кіслароду* (Л. Левановіч); *Калі ў чалавека выхавана любоў да Радзімы, ён паўсюль будзе памятаць пра свой абавязак перад ёй* (У. Колас) і інш.

Сапраўднага патрыёта не будзе без адданасці сваёй роднай мове. Любоў да роднай мовы – гэта тая бяздонная крыніца, з якой чалавек чэрпае ўсё сваё жыццё.

Як правільна заўважыў В. Ластоўскі, «мова – гэта той найкрапчэйшы вузел, які звязвае бацькоў з дзецьмі, людзей з людзьмі» [2, с. 34]. Народная педагогіка вялікую ўвагу надае выхаванню любові да свай нацыянальнай мовы. Гэтаму ж сугучны і нацыянальныя афарызмы: *Трэба, пакуль дзіцё малое, вучыць яго гаварыць роднай мовай, шанаваць гэту мову; трэба перасцярагаць, каб не перакручвалі яе чужымі словамі; трэба, каб маці пяяла дзецям свае песні простыя, прывучала шанаваць прадзедаўскія абычаі, – тады як сынок твой вырасце і пойдзе ў чужыя людзі, нічым з душы яго не выб'юць любві да свайго роднага, і дзе б ён ні быў – хоць за морам, яго заўсёды пацягне сэрца ў свой куток, да сваіх бацькоў* (В. Ластоўскі); *Мова! Яна разам з сэрцам даецца кожнаму чалавеку пры з'яўленні яго на свет. І па тым, як гучыць твая мова, песня, можна дагадацца, і як жыве народ* (М. Танк); *Здрадзіў мове – здрадзіў продкам, / Будзеш век ваўком хадзіць* (К. Турко); *Не згаджуся, што родныя мовы луской / Былі на рыбіне чалавецтва* (Р. Барадулін); *На родных мовах – як аднолькава, / Як горка плачуць дзеці ўсе…* (В. Зуёнак); *Родная мова, хоць бедная мова, / Мілей найбагатшай чужой!* (Я. Купала); *Мова раскрывае чалавека да самага нутра* (У. Гніламёдаў); *Страціў слова, страціў спадчыннае слова – / Штосьці страціў у душы абавязкова!* (Н. Гілевіч); *Мова – самы дарагі, самы каштоўны скарб у любога народа* (Н. Гілевіч); *Ад сэрца да сэрца – ці свята, ці будні – / Ідзі, мая мова, ідзі без прынукі!* (Н. Гілевіч) і інш.

Менавіта таму народная педагогіка вучыць паважаць Слова. Кніга – гэта не проста набор старонак з чорнымі літарамі. Яна з'яўляецца акном у свет ведаў, фантазіі і эмоцый. Кожная кніга на нашай паліцы адлюстроўвае нас саміх, нашы інтарэсы, мары і каштоўнасці. Таму «скажы мне, якія кнігі ў цябе на паліцы, і я скажу, хто ты». Кнігі вучаць вельмі важнаму – разуменню людзей, іх розных характараў і пачуццяў, дапамагаюць ацаніць гістарычную значнасць падзей і прасякнуцца глыбокімі думкамі і філасофіяй. Добрая кніга заўсёды натхняе нас на самаразвіццё і дасягненне новых вышынь. Яна можа стаць мудрым дарадцам і падказчыкам у складаных жыццёвых сітуацыях.

Нацыянальная афарыстыка змяшчае шмат выказванняў аб каштоўнасці Слова, кнігі ў нашым жыцці: *Лягчэй дабіцца, каб словы мелі бляск дарагога металу, але цяжэй – каб яны мелі яго і вагу, і звон, і вартасць* (М. Танк); *Добрая кніга заўсёды з'яўляецца лепшым другам у жыцці* (М. Танк); *А слова… Яно ўнутры жыцця. Здаецца, і колер мае, і пах, і сваё гучанне… А ўсё роўна не відна кожнаму. Вымаўляецца, але не чутна ўсім аднолькава* (В. Коўтун); *Ад слова прыбываюць сілы, / Дык не шкадуйце шчырых слоў!* (С. Грахоўскі); *Гэта страшная зброя – чалавечае слова* (В. Іпатава); *Ну, з чым, скажы, з якой каханкай / Магу я кніжку параўнаць?* (П. Броўка); *Чалавека можна ўзнесці да неба. Можна і ў гразь утаптаць, знішчыць, забіць. Словам* (А. Васілевіч); *Афарызмы – гэта терміновыя тэлеграмы розуму* (Г. Марчук); *Кніга – гэта журба па ўсім, што пражыта, і надзея на памяншэнне гэтай журбы ў будучым* (Г. Марчук); *Міфы, паданні, легенды – гэта паветра, якім дыхае кожнае масца* (Л. Рублеўская); *Часам добрага слова і хапае людзям, каб мірна жыць* (У. Рубанаў); *Слова, слова, слова – вось самы спажыўны хлеб для нашай душы* (Н. Гілевіч) і інш.

І, канешне, сапраўдны беларус шануе сваю сям'ю, сваіх бацькоў, сваіх продкаў. Толькі ў сям'і чалавек нараджаецца, атрымлівае клопат, любоў, якія ён нясе ў сабе ўсё сваё жыццё. Без сям'і немагчыма станаўленне чалавека як асобы. В. Сухамлінскі, педагог і выхавальнік, адзначаў: «Першы і галоўны выхавальнік дзіцяці, першы і галоўны педагог – гэта маці, гэта бацька» [3, с. 70]. Шчаслівая сям'я (а кожны з нас імкнецца да гэтага) не проста сваяцкія адносіны, а штосьці большае: перш за ўсё асаблівае стаўленне адзін да аднаго, узаемапавага, дапамога і, канешне, каханне. Калі ў сям'і моцнае каханне, значыць, у гэтай сям'і ставяцца да кожнага з яе членаў як да ўнікальнага і незаменнага. Унікальнымі ў такой сям'і будуць матчыны пірагі, бабуліны казкі, татаў клопат і ўвага. Старэйшыя людзі – гэта падарунак лёсу, які мы павінны шанаваць. Толькі добразычлівыя адносіны паміж бацькамі і дзецьмі стануць падмуркам шчаслівай сям'і, у якой заўсёды, у любой сітуацыі можна атрымаць дапамогу і падтрымку.

Нацыянальная афарыстыка таксама падкрэслівае вялікую ролю бацькоў у жыцці чалавека: *Як гэта па-божы справядліва, калі бацькі спаўна пералiваюць сваю энергію ў дзяцей, а дзеці спраўджваюць іх надзеі* (У. Ліпскі); *Пра сына гаварыць будуць, а бацькава імя добрым словам успамянуць* (Л. Калюга); *Са смерцю бацькоў мы трацім адчуванне дамоўкі, той сям'і, у якой мы выраслі, адчуванне роднасці, крэўнасці, што адчувалі асабліва востра да гэтага* (Б. Сачанка); *Радуйся, калі засталася бацькоўская хата і ёсць куды вяртацца. Стократ радуйся, калі ёсць куды і ёсць да каго* (Г. Марчук); *У кожнай дзіцячай слязе – вобраз маці* (М. Танк); *Кім ты б ні стаў – / Адной рукой гайдай калыску сына, / Другой – магілу дзедаву папраў* (М. Рудкоўскі); *Хто ж, як не дзеці, нясе на сабе і ў сабе, у сваёй крыві, бацькаву віну ці бляск подзвігаў?* (В. Іпатава) і інш.

Кожны беларус захоўвае ў сваім сэрцы любоў да роднай зямлі, роднай прыроды. Нашы продкі пакланяліся кожнай травінцы ў полі, кожнаму дрэву ў лесе. І сваіх дзяцей вучылі паважаць родную прыроду. Зараз мы таксама вучым нашых дзяцей паважаць родную зямлю.

Гэтыя традыцыі адлюстраваныя ў нацыянальнай афарыстыцы: *Толькі хоць раз перажыўшы расстанне з прыродай, пачынаеш даражыць ёю, як маці, якая цябе нарадзіла* (М. Танк); *Зямлі не дагледзіш – адпомсціць табе, / А потам напоіш – адмерыць без меры, / А шчыра палюбіш – палюбіць цябе* (М. Танк); *Матка-зямелька! / Эх, не, недарма ты / Корміш убогі свой люд!* (Я. Колас); *Саперніцтва з прыродай – непазбежнасць, / Як непазбежнасць – розум у прыродзе* (В. Зуёнак); *Кожны народ вучыцца ў прыроды, якая яго акружае* (В. Іпатава); *Прырода не адкрывыаецца чалавечаму розуму… Яна яго толькі зманьвае…* (С. Алексіевіч); *У прыроды свае законы і клопаты, свой парадак і свая звавядзёнка: калі свяціць сонцу, калі ісці дажджу, калі падаць снегу* (Л. Левановіч); *Чалавек не можа бачыць і чуць далей, як яму прырода дазволіла* (Я. Баршчэўскі); *Зямля чалавекам дзержыцца, адступіўся чалавек – і ўсё на закат пайшло* (А. Кудравец); *Часцей глядзі на зоркі, бо неба – тая ж кніга, і, можа, прачытаеш, хоць не ўсе, думкі мінулых людзей* (Л. Дайнека); *Няма агідных песень у прыродзе* (Н. Гілевіч) і інш.

Назва *Белая Русь* кажа аб чысціні і прастаце гэтых месцаў, незвычайных пейзажах, прыгажосці і багацці нашага краю. Уся гэтая прыгажосць нясе спакой і задавальненне. Нездарма нашу Радзіму параўноўваюць з лістком дрэва: *На карце вялікага свету / Яна – як зялёны лісток, / Сасмаглая песня лета, / Жывое вады глыток* (В. Вітка).

Беларусы – людзі мірныя, але калі прыйдзецца, мы будзем абараняць сваю Радзіму ад самага малога да самага старэйшага. Так здарылася і ў час Вялікай Айчыннай вайны, якая не абышла бокам ні адну сям'ю. Яна таксама згуртавала людзей розных нацыянальнасцей і рэлігій; усе ў роўных умовах змагаліся плячом да пляча за жыццё і свабоду будучых пакаленняў, за нашу агульную Айчыну. Подзвіг нашых продкаў не павінен і не можа быць забыты. Абавязак маладых людзей – шанаваць памяць аб Вялікай Айчыннай вайне, беражліва захоўваць яе ў душы і перадаюць наступным пакаленням.

Вельмі шмат афарыстычных выслоўяў змяшчаюць гэтую думку: *Як заўжды на вайне, галоўная плата – кроў, і плаціць той, хто наймей вінаваты* (В. Быкаў); *Яднанне дзеля абароны – гэта не толькі наказ гонару, але і аргумент розуму* (У. Калеснік); *Усе на вайне згарэлі, хто душой, хто целам, як каму наканавана* (В. Казько); *Кожная вайна бывае страшнейшая за тую, што была* (Б. Сачанка); *Мужык ваюе – зямля плача* (А. Кудравец); *Вайна вайной, а чалавеку хочацца жыць, і ён – насуперак усім страхам смерці – думае пра жыццё* (Н. Гілевіч) і інш. Ва ўмовах сучасных рэалій выхаванне імкнення да мірнага жыцця – адзін з важнейшых напрамкаў народнай педагогікі.

Несумненна, народная педагогіка – вельмі важны, неад'емны, значны элемент агульнай духоўнай нацыянальнай культуры. Ва ўмовах глабалізацыі найбольшая ўвага павінна ўдзяляцца менавіта нацыянальнай мове, якая з'яўляецца своеасаблівым падмуркам айчыннай культуры, што выступае бар'ерам на шляху ўзнікнення нівеліруючых глабалізацыйных працэсаў і ў той жа час становіцца найбольш надзейным сродкам абароны старажытных народных традыцый, абрадаў, звычаяў, святаў,

на якіх выхавана не адно пакаленне нашых продкаў. І наогул, нацыянальная мова выступае як своеасаблівы фільтр, які не дапускае ў нацыянальную культуру мноства нізкаякасных іншаэтнічных феноменаў. Складнікам такого фільтра з'яўляецца нацыянальная афарыстыка.

Афарыстычныя выслоўі выклікаюць цікавасць не толькі закладзеным у іх змесце вопытам пакаленняў, мудрасцю і сілай духу чалавека, яго маральнымі і эстэтычнымі ідэаламі, а і дакладнай і своеасаблівай характарыстыкай людзей, іх схільнасцей, вызначэннем і ацэнкай разнастайных узаемаадносін у грамадстве, з'яў рэчаіснасці. Яны надзвычай лаканічныя і вобразныя, выразныя і зразумелыя.

Змест афарызмаў універсальны і адначасова нацыянальна адметны [4, с. 3]: *Афарызмы ніколі не характарызуюць аднаго чалавека. Яны здольныя ахапіць усё чалавецтва. Але ж, як ні дзіўна, і ў іх прысутнічае нацыянальны каларыт аўтараў* (Г. Марчук). Гэты нацыянальны каларыт адлюстроўвае у т. л. і палажэнні народнай педагогікі, якія мы павінны перадаць у спадчыну сваім нашчадкам.

**Заключэнне**

Сама мова дапамагае фарміраваць успрыманне свету, і тым самым яна ўплывае на светапогляд людзей, выхоўвае ў іх здольнасці і патрэбу самаасэнсавання. Асабліва спрыяюць гэтаму працэсу нацыянальныя афарыстычныя выслоўі, у сэнсе якіх закладзены глыбінны роздум пра жыццё, пра тое, што служыць фарміраванню этнанацыянальнага светаўспрымання і агульначалавечай духоўнасці, нават для нашых сённяшніх ацэнак і рашэнняў. «Якое багацце мудрасці і дабрыні пранізлівай рассыпана па кнігах усіх народаў і часоў і забыта, ігнаруецца намі», – адзначаў некалі Леў Талстой. А Якуб Колас падкрэсліваў: «Кожны народ мае свой твар». Менавіта гэты твар адлюстроўвае нацыянальная афарыстыка як крыніца народнай педагогікі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Осипов, Е. Д. Педагогика семьи / Е. Д. Осипов ; под ред. А. Н. Сендер. – Брест : БрГУ, 2008. – 157 с.

2. Леванюк, А. Я. Пацеркі жыццёвай мудрасці : слоўн. беларус. літ. афарызмаў / А. Я. Леванюк. – Брэст : БрДУ, 2018. – 266 с.

3. Сухомлинский, В. А. Сердце отдаю детям / В. А. Сухомлинский. – Киев : Радянська шк.,1974. – 288 с.

4. Гаўрош, Н. В. Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў / Н. В. Гаўрош, Н. М. Нямковіч. – Мн. : Выш. шк., 2012. – 638 с.

## REFERENCES

1. Osipov, E. D. Pedagogika sem'i / E. D. Osipov ; pod red. A. N. Sender. – Brest : BRGU, 2008. – 157 s.

2. Levanyuk, A. Ya. Patserki zhytstsevai mudrastsi : sloun. belarus. lit. afaryzmau / A. Ya. Levanyuk. – Brest : BrDU, 2018. – 266 s.

3. Sukhomlinskii, V. A. Serdtse otdayu detyam / V. A. Sukhomlinskii. – Kiev : Radyans'ka shk., 1974. – 288 s.

4. Gaurosh, N. V. Afarystychnyya vysloui belaruskikh pis'mennikau / N. V. Gaurosh, N. M. Nyamkovich. – Mn. : Vysh. shk., 2012. – 638 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 21.10.2025*